У даўніну на святыя Каляды разам з калядоўшчыкамі і звездарамі па вёсках і мястэчках вандраваў незвычайны лялечны тэатр. Ва Украіне яго называлі вяртэп, у Польшчы- шопка, а ў нас на Беларусі  - батлейка. “ Батлейка -батлея – чароўная дзея”, - казалі пра гэты лялечны тэатр людзі.На Беларусі  батлейка існавала з 16 стагоддзя, на пэўны час была крыху забытая, але актыўна адраджаецца ў нашы дні. Вось і шасцікласнікі паспрабавалі аднавіць батлейкавы тэатр. І сваімі сіламі паставілі п’есу “ Цар Ірад”. Рабяты з захапленнем узяліся за справу: уласнымі рукамі рабілі лялькі, вучылі  словы. І адбыўся цуд – батлейка ажыла! Гледачы атрымалі сапраўдную асалоду ад убачанага спектакля. Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Ганчарова І.А.


